# Восень з тэатрам







1. Марына Плаўская з сястрой
2. Вольга Семучэнка
3. Тамара Байдун

**У нашай газеце і Telegram-канале "Культура і Мастацтва" працягваецца цыкл чайнвордаў і віктарын, якія мы робім сумесна з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь.**

Эрудыты, што першымі спраўляюцца з заданнямі, атрымліваюць квіткі на спектаклі і канцэрты, а пасля прагляду — дзеляцца ўражаннямі.

Начальнік аддзела інтэрнэт-маркетынгу групы кампаній "ЦВР «Кастрычніцкі»" **Марына Плаўская** даўно сочыць за навінамі праз наш Telegram-канал і рэгулярна ўдзельнічае ў віктарынах. Разам з сястрой пераможца схадзіла на оперу "Любоўны напой":

— Спектакль цудоўны! Мы атрымалі асалоду ад дзіўнага дзеяння, якое разгортвалася на сцэне. Нібыта патрапілі ў Італію! Дэкарацыі, касцюмы, выдатная ігра акцёраў — усё гэта пакінула незабыўныя эмоцыі. Дзякуй газеце і тэатру за такую выдатную магчымасць!

Прадавец адной з мінскіх крам **Вольга Семучэнка** наведала імпрэзу "Шэдэўры рускай музыкі".

— Даўно не слухала класіку, таму апынуцца на гэтым канцэрце стала прыемным падарункам, — распавядае Вольга. — Аркестр узрушыў! Назіраць, як музыканты-віртуозы зладжана працуюць, нібы адзіны арганізм, — чараўніцтва! У другой частцы гучалі кампазіцыі Рахманінава, якія ніколі не чула ўжывую. Неверагодна!

Супрацоўніцу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **Тамару Байдун** усхвалявала опера "Макбет":

— Цудоўная харэаграфія, дэкарацыі і касцюмы! А якія галасы ў выканаўцаў! Слухаць нашых оперных спевакоў — сапраўдная асалода! Дзякуй тэатру і газеце за магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе і атрымаць квіткі.